# Аб зьезьдзе настаўніцтва БССР.

У жыцьці і будаўніцтве БССР другі зьезд настаўніцтва—факт вялікага палітычнага значэньня.

Зьезд будзе новаю вялікаю вехаю на тым шляху, па якім ідзе настаўніцтва,—вялізарная частка ўсяе інтэлігэнцыі,—у супольнай працы з савецкаю ўладаю і пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі — партыі рабочае клясы.

Гэты зьезд будзе працаваць у абставінах, якія значна адрозьніваюцца ад умоў працы першага зьезду ў студзені 1925 г. Два галоўныя моманты будуць вызначаць яго зьмест, яго асноўныя задачы: 1) Настаўніцтва павінна ўсё больш і больш пераходзіць да таго, каб браць практычны ўдзел ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве, асабліва ў вёсцы, асабліва ў пытаньнях умацаваньня сацыялістычных элемэнтаў вясковае экономікі. У сучасных варунках настаўніцтва, як памоцнік і агэнт партыі, павінна ў першую чаргу разглядаць якраз у форме такога ўдзелу ва ўсім практычным сацыялістычным будаўніцтве.

2) Настаўніцтва павінна больш выразна ва ўсёй працы вызначыць сваю клясавую пазіцыю. Працэс Лістапада асабліва цікавы тым, што ён выкрывае дыфэрэнцыяцыю, якая намецілася ў шэрагах настаўніцтва, а гэта дыфэрэнцыяцыя зьяўляецца адбіткам клясавага расслаеньня вёскі. Праца настаўніцтва ў вёсцы толькі тады будзе ўмацоўваць справу сацыялістычнага будаўніцтва, калі настаўнік будзе разьбірацца ва ўсіх клясавых суадносінах у вёсцы і будзе прыгэтым займаць поўную пралетарскую лінію.

У сваёй працы зьезд павінен будзе акрэсьліць міжнароднае і ўнутранае становішча Саюзу і БССР і ўсе асаблівасьці клясавых суадносін у СССР. Зьезд, як і ў мінулым годзе, скажа аб тым, якую клясавую пазіцыю займае і будзе займаць пераважная большасьць настаўніцтва.

Адначасна зьезд павінен будзе даць поўную ацэнку пазіцыі Лістапада і ўсёй той кулацкай, па яе сацыяльнай сутнасьці, ідэолёгіі, якую выкрыў працэс.

Зьезд падагуліць вялікую практыку працы настаўніцтва на мясцох, яго ўдзел у грамадзкай працы, практыку працы пад кіраўніцтвам партыі ў асобе яе мясцовых арганізацый.

Зьезд вызначыць тыя шляхі, па якіх далей пойдзе праца настаўніцтва ў БССР. Галоўнае пытаньне, на якое настаўніцтва на сваім зьезьдзе павінна адказаць,—гэта пытаньне аб тым, як павінен і будзе ў далейшым працаваць кожны настаўнік, каб актыўна дапамагаць партыі праводзіць, асабліва ў гаспадарчым будаўніцтве, яе чарговыя задачы. Гэтыя задачы вызначаны ў апошніх пастановах партыі. Вось яны: індустрыялізацыя краю, прысьпешаньне сацыялістычнага назапашваньня, цьвёрдае правядзеньне рэжыму эканоміі, умацаваньне каапэрацыі, умацаваньне савецкага апарату, унясеньне ва ўсю працу шмат большае адказ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы